**Тэхналагічная карта ўрока беларускай літаратуры**
**“Маладыя гады, маладыя жаданні...”:**
**Маладое пакаленне ў рамане І. Шамякіна “Сэрца на далоні”. Сімволіка назвы твора**
**Настаўнік: Барсукова Галіна Мікалаеўна (ДУА “Забродская сярэдняя школа Шклоўскага раёна”)**

| Асноўныя этапы ўрока | Змест выкладаемага матэрыялу | Дзейнасць настаўніка | Дзейнасць вучняў | Формы, метады і прыёмы навучання | Прагназуемыя вынікі | Абсталяванне |
|---|---|---|---|---|---|---|
| І. Арганізацыйны | Стварэнне добразычлівай рабочай атмасферы | Устанаўлівае эмацыянальны кантакт. | Эмацыянальна настройваюцца на ўрок | Слоўна-арыентацыйны,нагляднасць прэзентацыі | Стварэнне добразычлівай атмасферы | Слайд 1-2 |
| ІІ.Успрыманне вучнямі праблемы ўрока. | | Настройвае вучняў на ўспрыманне тэмы. Арганізуе вучняў на складанне асацыятыўнага рада да паняцця “маладосць” | Слухаюць, складаюць асацыятыўны рад, запісваюць у табліцу. Аналізуюць , тлумачаць ключавыя словы. | Індывідуальная Рэпрадуктыўны. Унутраны маналог | Індывідуальнае складанне гіпотэзы. Пачатак работы па складанні асацыятыўнага рада | Картка ”Маладосць.Будучыня” |
| ІІІ.Паведамленне тэмы і мэты ўрока | Вызначэнне тэмы ўрока, | Выклікае цікавасць да вывучэння тэмы . Прапаноўвае вучням вызначыць задачы ўрока | Разам з настаўнікам вызначаюць тэму і мэты ўрока , вучацца вызначаць развіццёвыя задачы ўрока | Франтальная гутарка, індывідуальная праца | Стварэнне атмасферы зацікаўленасці зместам урока.Уключэнне вучняў у работу над тэмай, адаптацыя да работы. Разуменне задач урока | Слайд 3 |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Зварот да эпіграфаў | Прапанаваны тры выказванні (А. Вярцінскага, С. Басуматравай, А. Грачанікава) | Прапаноўвае вучням пазнаёміцца з эпіграфамі да ўрока і выбраць адзін,які ,на іх думку, падыходзіць па тэме. Абгрунтаваць сваю думку | Уважліва чытаюць эпіграфы да ўрока выбіраюць тое выказванне, ,што найлепш падыходзіць вызначанай тэме. Абгрунтоўваюць свой выбар. і выказваюць свае меркаванні. | Эўрыстычная гутарка | Знаёмства з эпіграфамі,выбар аднаго з іх. Развіццё лагічнага мыслення | Слайд 4 Картка з эпіграфамі |
| IV. Работа з тэкстам. Этап падрыхтоўкі да актыўнага і ўсвядомленага засваення ведаў | Арыентацыйная гутарка. | Прапаноўвае назваць прадстаўнікоў маладога пакалення, паглядзець інсцэніроўку ”Мары моладзі 60-х г.аб будучыні”,падрыхтаваную вучнямі.Задае вучням пытанні пра мары і жыццёвыя арыенціры моладзі 60-х гадоў. | Адказваюць на пытанні настаўніка, уважліва глядзяць інсцэніроўку, адказваюць на дадатковыя пытанні | Франтальная гутарка | Актывізацыя пазнавальнай дзейнасці вучняў з апорай на суб’ектыўны вопыт і на веданне зместу твора | Слайд5-6 |
| | Арыентацыйная гутарка. | Прапаноўвае вызначыць праблемы, з якімі сустрэлася моладзь 60-х гадоў | Называюць праблемы і вызначаюць, якія героі з імі сустрэліся,запаўняюць табліцу | Індывідуальная | Развіццё аналітычных уменняў.Уключэнне ў вучэбны пошук | Табліца |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Выступ ленне груп (абарона праектаў)** | Работа ў групах па апераджальных праблемных пытаннях.<br>*Група Славіка.* Што прываблівае вас у вобразе Славіка, а што вы не можаце прыняць у вобразе юнака?<br>***Група Тараса.*** Ці можна Тараса лічыць прыкладам , лідарам для моладзі 60-х гадоў? А з пазіцый сучасніка Тарас можа быць лідарам? | Прапаноўвае вучням прэзентаваць свае праекты | Прэзентуюць вынік дзейнасці ў групе, аргументуюць свой пункт гледжання,узнаўляюць эпізоды твора,прыводзяць цытаты | Групавая.<br>Праблемны.<br>Самастойная работа | Складанне гіпотэзы групай.<br>Уменне звязна і лагічна выказваць сваю думку.Развіццё крэатыўных здольнасцей. | Праекты па праблемных пытаннях Слайд 9-10 |
| V. Хвілінка рэлаксацыі | Рэлаксацыя ‘Каханне як кветка” | Прапаноўвае вучням зняць нервовае напружанне | Сядзяць, адпачываюць | франтальная | Зняцце нервовага напружання. | праектар Слайд 11 |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Працяг абароны праектаў | **Група Машы.** Каму ж даверыць свой лёс Маша—Славіку ці Тарасу? | Прапаноўвае вучням прэзентаваць свой праект групе Машы | Прэзентуюць вынік дзейнасці ў групе, аргументуюць свой пункт гледжання, праводзяць дыспут па праблемным пытанні. | Групавая.<br><br>Праблемны.<br><br>Самастойная работа | Складанне гіпотэзы групай,<br>Уменне звязна і лагічна выказваць сваю думку. Уменне аргументаваць свой адказ. Развіццё крэатыўных здольнасцей. | Праект па праблемным пытанні Слайд 12 |
| Зварот да эпіграфаў | Прапанаваны тры выказванні (А. Вярцінскага, С. Басуматравай, А. Грачанікава) | Прапаноўвае вучням выбраць яшчэ адзін эпіграф да ўрока, які, на іх думку, падыходзіць па тэме. Абгрунтаваць сваё меркаванне. Прапаноўвае пазнаёміцца з выказваннямі іншых пісьменнікаў і выбраць адно, якое стане іх жыццёвым правілам | Звяртаюцца зноў да эпіграфаў і выбіраюць тое выказванне, ,што найлепш падыходзіць у канцы ўрока. Абгрунтоўваюць свой выбар і выказваюць свае меркаванні. | Эўрыстычная гутарка | Дасведчанасць навучэнцаў у выкананні вучэбнай задачы, выкарыстанне суб'ектыўнага вопыту/ | Картка з эпіграфамі ,картка дадатковая "Жыццёвае правіла" Слайд14 |
| VI. Кантрольна-ацэначны этап | Узаемаацэнка Самаацэнка. | Прапаноўвае кіраўнікам груп ацаніць работу вучняў у групах, а потым кожнаму вучню ацаніць сваю работу ў групе і на ўроку. | Кіраўнікі груп ацэньваюць работу вучняў у групах, а потым кожны вучнь ацэньвае сваю работу ў групе і на ўроку. | Індывідуальная | Давер да вучняў Выкарыстанне аб'ектыўнага вопыту вучняў. | Табліца "Улік ведаў" Слайд 15 |
| VII. Падагульне | Сэнс назвы рамана, яго | Задае вучням пытанні | Адказваюць на пытанні настаўніка | .Франтальная | Вызначэнне ўзроўню засваення ведаў. | |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| нне. | сімволіка | | | | | |
| VIII. Рэфлексія | "Метад анкеты "5 з 20" | Арганізоўвае рэфлексійную дзейнасць вучняў. Прапаноўвае дзецям анкету "5 з 20", дзе неабходна вызначыць 5 важных жыццёвых каштоўнасцей і запісаць на сардэчках. | Асэнсоўваюць свой псіхалагічны стан. Аналізуюць вынік уласнай работы на ўроку | Індывідуальная.Франтальная Праблемны | Уменне аналізаваць уласную дзейнасць. Усведамленне выніковасці сваёй дзейнасці | Анкетак, сардэчкі Слайд16 |
| IX. Дамашняе заданне | Напішыце сачыненне-разважанне (на выбар)<br>" Як гэта хораша— юнацтва!.."<br>"Людзей ратуе толькі чалавечнасць"<br>"Як хораша таму на свеце жыць, хто мае мару.."<br>"На свеце без кахання жыцця няма,ёсць толькі існаванне"<br>Я раю прачытаць | Тлумачыць сэнс творчых заданняў. | Асэнсоўваюць прапанаваныя заданні і вызначаюць адно з іх для выканання дома. | Асэнсаванне дамашняга задання. | Развіццё аналітычных уменняў. | Картка Слайд 17 |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | раман Івана Шамякіна ........ (Рэклама кнігі) Падрыхтаваць відэаролік “Моладзь 21 стагоддзя—гэта мы” | | | | | |